■ Справы духоўныя

ПЕРШЫ ВЯЛІКДЗЕНЬ

Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі ПАВЕЛ сваю сустрэчу з журналістамі прысвяціў святу Пасхі, якое ён упершыню адзначае на беларускай зямлі

Фота БЕЛТА.

Прадстаўнікоў больш за тры дзясяткі выданняў беларускі архіпастыр павітаў пасхальным воклічам «Хрыстос уваскрос!» і, пачуўшы адпаведны адказ, прапанаваў пачаць размову святочным песнапеннем. Мітрапаліт Павел прызнаўся, што спачатку меў намер такую сустрэчу правесці на соты дзень свайго служэння на Беларусі, але дата гэта прыйшлася на Вялікі пост, таму зносіны з журналістамі былі адкладзены на Велікодны перыяд.

АРХІПАСТЫРСКІ КРЫЖ

Учарашняя двухгадзінная размова з журналістамі адбылася на наступны дзень пасля вяртання Патрыяршага Экзарха з паездкі па Тураўскай епархіі. «Так здарылася, што ў першыя дні свайго прызначэння сюды я наведаў Магілёўскую епархію, потым — Гродзенскую, пасля — Віцебскую, і вось — Тураўскую. І толькі ўчора мы заўважылі, што незнарок атрымаўся крыж: усход краіны — захад — поўнач — поўдзень», — заўважыў архіпастыр, дадаўшы, што вернікі нічога не лічаць выпадковым.

Беларускае Палессе выклікала добрыя ўражанні ў мітрапаліта Паўла, нягледзячы на тое, што многія тэрыторыі, якія ён наведаў, пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. «Мяне ўвесь час здзіўляе настрой у людзей, дух нашага народа, — сказаў ён. — Наш народ непераможны. Заходняму чалавеку гэта вельмі цяжка зразумець».

Патрыяршы Экзарх запэўніў таксама, што мае намер наведаць усе беларускія епархіі, прыходы і манастыры.

«З ДЗЯРЖАВАЙ У АЗАРТНЫЯ ГУЛЬНІ НЕ ГУЛЯЮ»

На пытанне журналістаў, ці сочыць ён за чэмпіянатам свету па хакеі, які праходзіць гэтымі днямі ў Мінску, уладыка адказаў дыпламатычна: «Я «хварэю» за тых, хто перамагае. Мне падабаецца прыгожы хакей, прыгожы футбол, хаця мой любімы спорт — валейбол, у які я вельмі часта гуляў, калі быў студэнтам семінарыі і духоўнай акадэміі. Цяпер, калі ёсць магчымасць, я гляджу снукер. Сам калісьці захапляўся гульнёй у більярд. Мне не падабаецца тое, што сёння, на жаль, у спорце вельмі выразна прысутнічае бізнес. Я таксама не прыхільнік таго, каб людзі ставілі падножкі, прымянялі фізічную сілу там, дзе гэта не трэба».

Экзарх параіў нікому не гуляць у азартныя гульні. Ён нават супраць латарэйных гульняў. «Калі мне прапануюць купіць латарэйны білет, я кажу, што з дзяржавай у азартныя гульні не гуляю», — пажартаваў ён.

ПАДЗЕІ ВА УКРАІНЕ — АГУЛЬНЫ БОЛЬ

Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Павел успрымае падзеі ва Украіне як агульны боль славянскіх народаў. «У нас агульная вера, рэлігія, культурная аснова. Палітыка нас падзяліла, але ўсе мы маем агульныя карані. Мы адзін народ», — адзначыў уладыка. Ён выказаў надзею, што сітуацыя ва Украіне будзе хутка ўрэгулявана мірным шляхам.

Прадстаяцель Беларускай праваслаўнай царквы згодны з меркаваннем, што прычынай таго, што адбываецца ва Украіне, паслужыла карупцыя, а таксама падзел грамадзян на тых, хто жадае ісці «на захад» і тых, хто жадае ісці «на ўсход». Пры гэтым Экзарх падкрэсліў, што людзі жадаюць проста мірна жыць і працаваць, і многім з іх усё адно, якая ўлада будзе ў краіне. «Паны б'юцца, а людзям даводзіцца ўсё гэта расхлёбваць. Галоўнае, каб людзі жылі ў міры і згодзе», — лічыць мітрапаліт.

Па яго словах, у сітуацыі, якая склалася, задача Царквы — маліцца, а дыпламаты і палітыкі павінны сесці за стол перамоў і зрабіць усё магчымае для таго, каб спыніць гвалт ва Украіне.

ЖАНЧЫНА З БАРАДОЙ — СКАЖЭННЕ БОЖАГА ВОБРАЗА

Мітрапаліт Павел па просьбе журналістаў пракаментаваў з пункту гледжання Царквы вынікі міжнароднага песеннага конкурсу «Еўрабачання-2014», дзе перамог спявак з Аўстрыі, які выступае пад псеўданімам Канчыта Вурст і вядомы публіцы як жанчына з барадой.

«Я паглядзеў — нават не ведаю, як сказаць, — на гэтага ці на гэту... Гэта ж пародыя. Я, як епіскап, адразу ж угледжваю падспудную думку: артыста паспрабавалі зрабіць падобным на выяву Хрыста. І вось гэта «яно» сёння захапляе людзей, займае першае месца. Гэта нават каментаваць нязручна», — сказаў мітрапаліт Павел.

«Я ніколі нікога не рэкамендаваў бы накіроўваць на гэты форум, калі там прызнаецца за вяршыню дасканаласці згубленая і знявечаная выява Божая ў чалавеку», — сказаў прадстаяцель БПЦ.

Ён таксама выказаў сваё меркаванне з нагоды канцэрта польскай групы «Бегемот» у рамках іх тура «Сатаніст»: «На 27 мая плануецца рок-канцэрт нейкай групы — па-мойму, «Бегемот». Нельга дапускаць выступленні груп сатанінскай скіраванасці. Трэба рабіць усё, каб сатанізм не прайшоў», — падкрэсліў архіпастыр.

З КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВОЙ — ДОБРЫЯ ЎЗАЕМААДНОСІНЫ

«З Рымска-каталіцкай царквой у Беларусі ў нас выбудоўваюцца добрыя адносіны. Гэта шматвяковая традыцыя, — сказаў журналістам кіраўнік Беларускай праваслаўнай царквы. — Мы не ўмешваемся ў справы адзін аднаго».

Пры гэтым прадстаяцель БПЦ нагадаў, што сёлета на пачатак чэрвеня запланавана правядзенне ў Мінску праваслаўна-каталіцкага форуму, які ўяўляе сабою нефармальную пляцоўку для зносін іерархаў дзвюх канфесій.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■ Вытокі

ПРЫЦЯГНЕННЕ

Ехала на размову. Імкнулася злавіць адказ з маленькага цёмнага каменьчыка, на якім праступала выява, а слёзы не давалі пабачыць яе. Але ж яна дыхала са мной, жыла са мной цэлае імгненне, калі мае думкі растварыліся ў прасторы, дзе былі толькі мы з Маці і Яе вялікім Дзіцяткам. Размова склалася — маўклівая. Я ёй: пра сэрца і душу, якая не на месцы; пра людзей, якім не жывецца спакойна, пакуль не пазбавяць кагосьці радасці; пра несправядлівасць і вайну, якой патыхае ў паветры; пра цуды, якім сама дзівілася не раз. А побач такіх маўклівых — чарга. І ва ўсіх спадзеў, што Яна выслухае і пачуе. Што супакоіцца душа, скончыцца несправядлівасць, а любоў пераможа.

У Жыровіцы па гэта едуць. І ўжо не адно стагоддзе цудатворны абраз Прасвятой Маці Божай Жыровіцкай мае вялікую сілу выслухоўваць і дапамагаць. Былі і ёсць тыя, хто захацеў дыхаць і жыць з ім у адной прасторы. Дзякуючы ім у Беларусі больш за пяць стагоддзяў ёсць Свята-Успенскі мужчынскі манастыр у Жыровіцах, што на Слонімшчыне.

— Гэта найбуйнейшы манастыр у Беларусі, — гаворыць Наталля Агарэлышава, якая суправаджае групу паломнікаў з Мінска. — Ён праваслаўны, але належаў у розныя часы іншым хрысціянскім канфесіям, якія шанавалі абраз Жыровіцкай Божай Маці. Манастыр ніколі не закрываўся, нават у гады ганенняў на царкву ў савецкі час. Нібыта сама Прачыстая Дзева ахінула яго сваім ахоўным покрывам — і ніхто нічога не змог зрабіць. Тут дагэтуль захоўваюцца

СЛЯДЫ БАГАРОДЗІЦЫ

Яна з'явілася сама: цудатворны абраз людзі атрымалі ў 1470 годзе (гэтая падзея святкуецца штогод 20 мая). Напрыканцы XV стагоддзя на месцы сучасных Жыровіц і далёка навокал быў густы лес. Ён належаў праваслаўнаму шляхціцу Аляксандру Солтану. Аднойчы яго пастухі заўважылі незвычайнае ззянне, якое сыходзіла з дзікай грушы. Калі падышлі бліжэй, убачылі на галінках невялічкі абраз, велічынёй з дзіцячую далонь, з выявай Прасвятой Багародзіцы з дзіцяткам Ісусам на руках. Знаходку аднеслі Аляксандру ў маёнтак. Ён, убачыўшы абраз, вялікага значэння яму не надаў. Паклаў у куфэрак у сваім пакоі. На наступны дзень запрасіў да сябе гасцей, і паміж іншым вырашыў паказаць знаходку. Але яго здзіўленню не было мяжы, калі ў куфэрку абраза не знайшоў. Праз некаторы час пастушкі зноў знайшлі яго на ранейшым месцы. Тады Аляксандр зразумеў, што гэта знак Божы, даў абяцанне пабудаваць храм на гэтым месцы. Першы храм быў драўляны...

Праз брамку з абразом трапляеш ва ўтульны дворык. Ціха. Жыццё рана пачынаецца ў храме. Але зусім не такое жыццё, у якім пры суцэльнай запатрабаванасці можаш усё роўна пачувацца непрыкаяным. Толькі трапляеш у сабор — заблытаныя думкі сцішваюцца, не стукаюць малатком у скронь. Яны ўзнесліся пад высокі купал і просяць палёгкі для сваёй гаспадыні. У велічэзным саборы малітоўны голас знутры прабівае браню, якая ахоўвала твой адчай — і ён адступае. Азіраешся: няўжо з кожным адбываецца нешта падобнае?

Божы цуд: выява ў камені.

На богаслужэнні сярод людзей у чорных расах пазнаю аднаго манаха. Потым, у двары, прашу яго ўдакладніць гісторыю Жыровіцкага цуду — хто лепш за насельнікаў манастыра яго адчувае? Брат Іаан (Бембель), у міры вядомы як паэт Зніч, аўтар цудоўных вершаў пра Беларусь, прыняўшы веру ўсім сэрцам, прыйшоў у манастыр. Ён паказвае на галоўны сабор і тлумачыць:

— Прастол Успенскага сабора знаходзіцца на месцы з'яўлення абраза, там, дзе расла дзічка. З-пад грушы, дзе быў яўлены цудатворны абраз, стала біць крыніца. Цяпер выток крыніцы знаходзіцца ў спецыяльна абсталяваным калодзежы, пад алтаром Успенскага сабора. Менавіта ў гэтым саборы і знаходзіцца цудатворны абраз Жыровіцкай Божай Маці, але толькі ў летні перыяд (красавік—лістапад). На Казанскую (4 лістапада) яго пераносяць у царкву Святога Мікалая, а ў вялікім храме застаецца копія. Але нават ад яе засведчаны цуды! Іх творыць вера і Маці Божая, якая ўсіх чуе...

Брат Іаан (Бембель) распавядае пра Жыровіцкі цуд.

Амаль адразу пасля з'яўлення абраза Прасвятой Багародзіцы ў Жыровіцы сталі сцягвацца людзі. Нехта тут заводзіў сем'і (і ўзнікла паселішча), нехта прысвячаў сябе служэнню Богу ў манаскім званні. Усе, хто з верай і малітвай прыходзілі да Жыровіцкай Божай Маці, атрымлівалі ацаленне ад душэўных і цялесных хвароб. Да цудатворнага абраза прыходзілі нават каралі Рэчы Паспалітай, шанавалі яго і магнаты — такія, як Сапегі, Радзівілы. Найбольш па часе манастыр належаў уніятам (у прыватнасці, базыльянам). Вернікі-каталікі прызнавалі справы Багародзіцы, засведчаныя ў Жыровіцах. Пастановай папскага капітула было прынята рашэнне пра каранацыю абраза Жыровіцкай Божай Маці, што і адбылося ў 1730 годзе. І, напрыклад, у касцёле святога Андрэя ў Слоніме ёсць спіс Жыровіцкага абраза — ён там у кароне.

Абраз Жыровіцкай Божай Маці — самы маленькі з багародзічных, яго памер — усяго 56 на 44 міліметры. Але і маленькі (праўда, у вялікім акладзе) сярод багатых роспісаў барочнага храма, ён адразу прыцягвае ўвагу. Гэта невялічкая рэльефная выява Прасвятой Багародзіцы з Дзіцяткам на руках, выразаная на яшме. У іканаграфіі такая выява адносіцца да тыпу «Замілаванне» (калі шчака Багародзіцы прыхіляецца да шчакі дзіцяці). Засведчана, што першапачаткова ад абраза ішло яркае святло і тонкі водар. Але ікона пацямнела і паблякла пасля пажару, які здарыўся ў сярэдзіне XVI стагоддзя.

— Пасля пажару абраз лічыўся страчаным. Але Багародзіца не пакінула свайго ўлюбёнага месца і праз некаторы час з'явілася перад сялянскімі дзецьмі: стаяла на вялікім камені і трымала ікону ў руках, — распавядае экскурсантам студэнт 5 курса Мінскай духоўнай семінарыі Уладзімір Ізюмаў. — Калі на покліч дзяцей прыйшлі дарослыя, то знайшлі на камені абраз, а побач гарэла свечка. Камень, на якім стаяла Багародзіца, агарадзілі, і з цягам часу на гэтым месцы была пабудавана царква ў гонар Нараджэння Прасвятой Багародзіцы, у народзе вядомая як Яўленская. Цяпер камень з'яўляецца асновай прастола ў гэтай царкве.

Храм быў зусім маленькі, але раней у ім знаходзілася пахавальня. Дагэтуль тут спачываюць мошчы архіепіскапа Мінскага Міхаіла Галубовіча. Яшчэ 76 чалавек, якія спачывалі ў Яўленскай царкве, цяпер пахаваны на манастырскіх могілках — вось дзе лепей за ўсё адчуваеш, што і пасля смерці можна рабіць свае

Шлях да Богаяўленскай царквы і Крыжаўздзвіжанскага храма.

Успенскі сабор Жыровіцкага манастыра здалёк вітае гасцей.

Вера і веды

Жыровіцы сёння прыцягваюць вялікую колькасць маладых людзей. Тут знаходзяцца Мінская духоўная семінарыя і акадэмія. У 1945 годзе ўлады дазволілі адкрыць пастырска-багаслоўскія курсы, якія пазней былі перайменаваныя ў Мінскую духоўную семінарыю. Аднак у тыя гады абітурыенты і семінарысты сутыкаліся з псіхалагічнай апрацоўкай, пагрозамі, таму да першага выпуску дацягнулі ўсяго 6 чалавек. Семінарыя была закрыта. Адраджэнне яе пачалося ў 1989 годзе. Статус вышэйшай навучальнай установы семінарыя атрымала ў 1992 годзе. Сёння тут навучаецца каля 200 чалавек. Ёсць завочнае аддзяленне, на якім вучацца ў асноўным святары. На першым паверсе семінарыі была пабудавана царква трох свяціцеляў: Васілія Вялікага, Грыгорыя Багаслова і Іаана Златавуста, так званы семінарскі храм. На другім паверсе — канцылярыя, адміністрацыя і бібліятэка. На трэцім — вучэбныя класы для студэнтаў семінарыі дзённай формы навучання і акадэмія. На чацвёртым паверсе — інтэрнат для завочнікаў. Для студэнтаў семінарыі і акадэміі нядаўна пабудавалі новы інтэрнат — на ўзроўні 3-зоркавага гатэля: 4 чалавекі на блок. Студэнты плацяць за інтэрнат, але ж і стыпендыю атрымліваюць.

Рэгенцкае вучылішча было адкрыта ў 1996 годзе. У ім навучаюцца і дзяўчаты, атрымліваюць ступень рэгента царкоўнага хору і выкладчыка Закона Божага. Як ні дзіўна, але ў беларускія Жыровіцы прыйшоў Балонскі працэс: навучаюцца 4 гады замест 5. Пасля бакалаўрыяту ідзе магістратура, акадэмія і г.д., як у дзяржаўнай ВНУ. Толькі акцэнт робіцца на багаслоўскіх дысцыплінах, хоць вучаць і тое, што ёсць у свецкіх ВНУ: філасофію, гісторыю, шмат моў. Іншая справа, што кожны дзень тут пачынаецца а 8-й раніцы з малітваў у семінарскім храме.

СПРАВЫ ДЗЕЛЯ ЖЫЦЦЯ

Свята-Успенскі Жыровіцкі манастыр вядомы сваімі старцамі. Асабліва жывая памяць пра тых, хто адышоў не так даўно. У 2006 годзе пакінуў гэты свет апошні старац манастыра архімандрыт Мітрафан (Ільін), які пражыў тут 58 гадоў. Быў надзелены дарам прадбачання, шмат хто пры жыцці да яго прыходзіў па параду. І цяпер ля яго магілкі моляцца і пакідаюць запіскі з просьбамі аб дапамозе: у манахаў асаблівая місія служэння людзям.

Пра гэта думаеш і калі пераводзіш погляд на Жыровіцкія могілкі, што адкрываюцца ўдалечыні на ўзгорку, побач з храмам Георгія Пераможца. У гэтым драўляным зялёным храме служаць па суботах. Пасля кожнай службы — паніхіда, калі моляцца за спачылых. Так пайшло з XVII стагоддзя, пасля эпідэміі халеры. Браты перасяліліся ў іншы манастыр, каб вярнуцца, калі хвароба адступіць. Але па ўласным жаданні тут застаўся іераманах Мікалай Акуневіч. Ён прычашчаў тых, хто паміраў, адпяваў іх. Падчас эпідэміі пахаваў больш за 600 чалавек. Нёс свой крыж.

З думкамі пра свой крыж у Жыровіцы ехалі і едуць паломнікі. Нездарма ў нас кажуць: «Як трывога, дык да Бога». Іду па шырокай лесвіцы — ледзь не на ўсю шырыню сабора. Уласна дзеля яе Крыжаўздзвіжанскі храм і быў пабудаваны напрыканцы XVIII стагоддзя. Але ўжо наверсе разумееш, што не ісці па ёй трэба — кланяцца. Гэта копія лесвіцы з палаца Понція Пілата, па якой Ісус Хрыстос падымаўся на суд — 28 прыступак. Арыгінал лесвіцы знаходзіцца ў Рыме, дзе і ў нашы дні вернікі падымаюцца па прыступках на каленях. Арыгінал з мармуру, але пакрыты дубам, каб мармур не сціраўся. Калі Збаўца падымаўся, на прыступках засталася яго кроў, таму ў лесвіцы зроблены спецыяльна выемкі, да якіх людзі цяпер прыкладваюцца. У нас у Жыровіцах выемкі таксама былі — яны адзначаны квадрацікамі. Раней на кожнай з іх знаходзіліся каўчэгі з мошчамі ўгоднікаў Божых, і калі прыходзілі ў храм вернікі, яны на каленях падымаліся па прыступках, чытаючы асаблівыя малітвы. Але ў XIX стагоддзі часцінкі мошчаў з прыступак дасталі і змясцілі ў спецыяльны крыж-машчавік, які знаходзіцца ў галоўным саборы па правы бок ад царскай брамы — у адваротным баку ад цудатворнага абраза. Але ж нават яму выпаў свой няпросты шлях, калі асобныя манахі ратавалі і ахвяравалі сабой дзеля веры.

У гісторыі манастыра былі моманты, калі абраз Божай Маці пакідаў гэтае месца. Напрыклад, падчас Першай сусветнай вайны ён быў вывезены ў Маскву і знаходзіўся ў саборы Васілія Блажэннага. Пасля закрыцця сабора быў перавезены ў падмаскоўны Кацярынінскі манастыр. Дадому вярнуўся ў 1922 годзе — распавядаюць, што жыровіцкі архімандрыт Ціхан (Шарапаў) вывез яго ў слоіку з варэннем. Другі раз абраз пакідаў манастыр разам з нашым беларускім прападобным пакутнікам архімандрытам Серафімам Жыровіцкім (Шахмуцем): у цяжкія часы вайны манахі хадзілі з хрэснымі хадамі, займаліся місіянерствам, адчынялі храмы, хрысцілі людзей. Але пасля вайны Серафім Жыровіцкі быў рэпрэсаваны, загінуў у лагеры і цяпер услаўляецца ў ліку беларускіх святых.

У савецкі час шмат якія манастыры ў Беларусі закрываліся. Жыровіцкі выстаяў і нават па блаславенні тагачаснага мітрапаліта Філарэта даў прытулак сёстрам з закрытых жаночых манастыроў Гродна і Полацка. І цяпер можна бачыць манахінь, якія дажываюць тут свой век у малітвах да Прачыстай...

Цяпер у Жыровіцкім манастыры каля 40 манахаў і больш за паўсотні паслушнікаў. Клопатаў у сучасных насельнікаў шмат: манастырская гаспадарка вялікая (сажалкі з рыбай, зямля, на якой тую ж бульбу вырошчваюць, агародніну, садавіну). Але ж галоўнейшыя за зямныя — справы малітоўныя. Моляцца за тых людзей, хто прыязджае сюды, і за тых, хто не просіць аб малітвах, наогул — за ўвесь свет...

Малітва тут суправаджае ўсіх: і манахаў, і гасцей (для іх ёсць Дом паломніка), якія імкнуцца дакрануцца да цуду, паглыбіцца ў яго. Нават літаральна. У Жыровіцах дзве крыніцы: старая за 1,5 кіламетра ад манастыра, але здалёк відаць блакітны купал над новай купальняй, якую асвяцілі ў гонар Божай Маці. Вада — адна, як і зямля, з якой яна выцякае.

Было халаднавата. Надзеўшы чыстую кашулю, хрысцішся і, каб не мерзнуць, хуценька — з галавой... Вада апякае. Адзін раз, другі, трэці. Цела не адчуваеш — нібыта і няма яго. А ёсць толькі існая сутнасць — дзівішся, наколькі празрыста-зіхатлівай яна можа быць, і ледзь не ўзлятаеш над зямлёй, наверх, пасля таго, як усё цяжкае і штучнае патанула ў ледзяной вадзе. І вось у гэты момант прыходзіць нечаканае цяпло, нібыта нехта абагрэў і падзяліўся сваімі бясконцымі сіламі.

Ларыса ЦІМОШЫК

■ Несакрэтны ўспамін

Блакітная сукенка для Раі

Здаецца, гэта было ўчора — яе танец у вызваленым Мінску ў блакітнай сукенцы фасону «сонцаклёш»... 90-гадовая Раіса Аляксандраўна УВАРАЎСКАЯ, ветэран Вялікай Айчыннай і органаў дзяржаўнай бяспекі, заплюшчвае вочы і паглыбляецца ва ўспаміны. Карцінкі з нядаўняга былога зноў прымушаюць перажыць і страх, і радасць.

У 17 гадоў Раіса атрымала пасаду тэхнічнага сакратара ў райкаме камсамола горада Паўлава Горкаўскай вобласці. Праўда, для гэтага давялося пайсці на падман — сусед-міліцыянер дапамог дзяўчыне атрымаць пашпарт як паўналетняй. Праца спадабалася. Трэба было хадзіць па розных камсамольскіх арганізацыях і адбіраць актыўную моладзь. Пазней яна даведалася, што такая моладзь была патрэбна для службы ў органах дзяржаўнай бяспекі. Паколькі і самой Раісе ініцыятывы было не займаць, то яна таксама апынулася на службе ў НКУС — працавала перакладчыкам у падраздзяленні па цэнзуры ваеннай карэспандэнцыі. Праз год службы яе разам з групай з 25 чалавек накіравалі ў камандзіроўку ў вызваленыя ад фашысцкіх акупантаў раёны Беларусі.

— Калі ехалі ў Беларусь, непадалёку ад Бранска наляцелі варожыя самалёты і наш поезд трапіў пад абстрэл. Гэта было вельмі страшна, — расказвае Раіса Аляксандраўна. — Бегчы ж няма куды... Вагоны былі засланы саломай. Некаторыя дзяўчаты засоўвалі галаву ў гэтую салому і рыдалі ад дзікага страху... Мы цудам выжылі тады...

Крычаў да моманту іх прыезду быў проста зруйнаваны. Ні дамоў, ні дарог. Жыць няма дзе. Камандзір выдаў лапаты і загадаў капаць сабе зямлянкі. «Столь» дапамаглі зрабіць салдаты, з пажарышчаў прыцягнулі нейкія ложкі, печ-буржуйку — неяк жылі. Штодня разбіралі завалы, прыбіралі камяні, ачышчалі вуліцы... Ва ўсім горадзе ўцалела ўсяго некалькі будынкаў, у тым ліку невялічкая царква, якую пачалі выкарыстоўваць для судовых пасяджэнняў.

— Неяк там праходзіў адкрыты працэс над паліцаем з ліку мясцовых жыхароў. Народу сабралася шмат... Міліцыя не ведала, як людзей супакоіць, — такая нянавісць да гэтага паліцая была. Разарваць яго хацелі. Здаровы, высокі, дужы хлопец, гадоў 27... Расстраляў больш за 30 мірных жыхароў. Казалі, што сямёра дзяцей закалоў штыком у ложку. Працэс доўжыўся тры дні, і ў выніку прыгаварылі злодзея да смерці праз павешанне. Народ абураўся такому мяккаму пакаранню...

Пазней у Гомелі ў складзе групы перакладчыц Рая жыла ў будынку, дзе падчас акупацыі размяшчалася нямецкая ваенная камендатура. Яна ўпершыню пабачыла палонных нямецкіх салдат. Глядзела на здаровых маладых людзей і не магла дараваць, думала пра безабаронных жанчын і дзяцей, якіх гэтыя хлопцы прыйшлі забіваць.

У Магілёве, адразу пасля вызвалення горада, дзяўчаты з групы Увараўскай атрымалі распараджэнне ўзяць удзел у транспарціроўцы целаў забітых нямецкіх салдат. Трупаў было так многа, што насілак не хапала, і дзяўчаты цягалі іх на плячах... Там, у Магілёве, Раісу перавялі ў контрразведку, прысвоілі ёй званне лейтэнанта, і яна працягвала службу на пасадзе оперупаўнаважанага.

Пасля адступлення немцаў на вызваленых тэрыторыях хутка пачалі збірацца ў банды памагатыя ды агенты. Разгарнулася маштабная барацьба з бандытызмам.

— Я ўдзельнічала ў такіх аперацыях. Аднойчы аператыўнікі даведаліся, што кіраўнік адной з банд ноччу наведаецца да сваёй каханкі. Мяне ўключылі ў опергрупу для вобыску затрыманай: жанчын павінны абшукваць жанчыны. Заселі ў засадзе. Нас «засяклі», аднак ні адзін, ні друг бок не хацелі страляць, каб не выявіць сябе цалкам. Таму бандыты пачалі адбівацца паленамі з вогнішча. Ой, як жа трапіла ў мяне адно палена — нежартоўна пацярпела я тады... Ну, галоўнае, што не куля і што бандыта ды яго памагатых усё ж затрымалі...

У цёмны час сутак аператыўнікам забаранялася хадзіць па тратуарах — толькі па праезнай частцы. Нямецкія памагатыя хаваліся ў падвалах дамоў і кідалі з акенцаў вяроўкі з пятлёй. Хто туды ступіў, таго зацягвалі ў падвал і забівалі. Дый нярэдка проста стралялі з-за дома.

Пасля пераводу ў Мінск Раісу зноў чакала цяжкая фізічная праца: штодня і ўсе выхадныя даводзілася прыбіраць горад. Ніхто не ленаваўся. Нават 7-гадовыя дзеці падбягалі да дарослых і хоць бы па адным камені пераносілі.

Камандзір выдаў лапаты і загадаў капаць сабе зямлянкі. «Столь» дапамаглі зрабіць салдаты, з пажарышчаў прыцягнулі нейкія ложкі, печ-буржуйку — неяк жылі.

— Калі 16 ліпеня 1944 года ў Мінску адбыўся партызанскі парад, у паветры лунаў водар сапраўднага свята! Дзяўчаты з упраўлення НКУС павінны былі стаяць у ачапленні. Так хацелася апрануць што-небудзь святочнае, а нічога ж не было! Але ж напярэдадні атрымалі мы гуманітарную дапамогу ад амерыканцаў. Гэты былі пераважна кансервы, але траплялася і адзенне. Мне дасталася сукенка — блакітны «сонца-клёш»! Вось дзе было шчасце — змяніць ваенную форму на гэтую сукенку! Праўда, прыгажосць ацанілі не ўсе. Калі міма нас ішлі калоны партызан, адзін з іх працадзіў у мой бок «Падсцілка нямецкая... Відаць, не галадала ў акупацыі...» Я не пакрыўдзілася, толькі памахала ўслед і паслала паветраны пацалунак...

Прыгожая сукенка аказалася «нешчаслівай». На чарговую гадавіну Перамогі Рая зноў апранула яе для прагулкі з калегамі па парку імя М. Горкага. Шмат танцавалі, пасля расселіся на траве — жартавалі, смяяліся. Хлопцы запускалі нейкія салюты, і раптам адзін з феерверкаў упаў на падол блакітнага клёша. Сукенка загарэлася, і аднавіць яе ўжо не ўяўлялася магчымым.

***P.S.** Капітан запасу Раіса Аляксандраўна Увараўская выйшла на пенсію ў 1987 годзе. Кажа, што асаблівасці службы ў органах у мірны час — вялікі сакрэт.*

Святлана БАРЫСЕНКА.
Фота прэс-службы КДБ